

***Ірына АПАНАСІК,***
*выхавальнік*
*дашкольнай адукацыі*
*вышэйшай*
*катэгорыі, яслі-сад*
*№1 г.Дзяржынска*
*Мінскай вобласці*

# "СЦЯГ БЕЛАРУСІ"

## Занятак па адукацыйнай галіне "Дзіця і грамадства"

## (4-5 гадоў)

**Праграмныя задачы:** фарміраваць у дзяцей паняцце «сімвал нашай Радзімы", уяўленні аб беларускім сцягу, аб сімвалічным прызначэнні яго колераў, пашыраць кругагляд у галіне дзяржаўнай сімволікі актывізаваць слоўнікавы запас, замацоўваць назву частак сцяга; развіваць пазнавальную цікавасць, развіваць дробную маторыку рукі пры вкладванні сцяжка з палачак; выхоўваць у дзяцей пачуццё патрыятызму, паважлівага стаўлення да сцягу нашай краіны.

**Матэрыял і абсталяванне:** дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь, аўдыё-запіс гімна, відэаролік "Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь", маленькія сцягі Рэспублікі Беларусь па колькасці дзяцей, , інтэрактыўная гульня "Сцягі розных краін", электронная дыдактычная гульня "Пытанне – адказ", рознакаляровыя падліковыя палачкі на кожнага выхаванца.

*(прэзентацыя)*

### Ход занятка

*Дзеці становяцца ў круг, бяруцца за рукі, разам з выхавальнікам прамаўляюць хорам:*

**Выхавальнік (В.).** Дзеці, паслухайце такія радкі верша:

*Змалку звалі цябе*
*Мы сваёю Радзімаю*
*Беларусь, Беларусь*
*Як ты сэрцу любімая.*

**В.** Як вы думаеце, аб чым мы будем размаўляць?

**В**. Так. Аб Беларусі і дзяржаўных сімвалах нашай краіны.

**В.** (*Слайд 1*) Ва ўсе часы ў розных краінах і землях існавалі знакі, з дапамогай якіх людзі паказвалі, да якога племені ці народа яны належаць.

Сёння адметнымі знакамі краін з’яўляюцца герб, сцяг, гімн. Гэта дзяржаўныя сімвалы. Герб, сцяг і гімн ёсць у кожнай незалежнай і самастойнай дзяржавы.

Гімнам называюць урачысты спеў у гонар каго- або чаго-небудзь. Дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь услаўляе беларускую зямлю і яе людзей. Гэта галоўная песня краіны. У знак павагі гімн слухаюць і спяваюць стоячы.

*Спаўняецца дзяржаўны гімн Рэспублікі Беларусь*

*Выхавальнік бярэ ў рукі беларускі сцяг.*

**В.** *(Слайд 2)* У кожнай краіне ёсць свой сцяг. Сцяг – гэта сімвал дзяржавы. Паглядзіце на гэты сцяг. Гэта - сімвал нашай Радзімы – Рэспублікі Беларусь.

**Дэманстрацыя відэароліка “Сцяг Беларусі”**

*(На сцягу Беларусі тры паласы: чырвоная, зяленая і белая, упрыгожаная арнаментам. Кожны колер мае сваё значэнне.*

*Чырвоны колер сімвалізуе сілу, мужнасць і энергію. Гэта колер узыходзячага сонца, галоўнай крыніцы жыцця на зямлі.*

*Для беларусаў гэта яшчэ і колер сцягоў дывізій Чырвонай Арміі і брыгад беларускіх партызан, якія вызвалялі нашу зямлю ад ворагаў у гады Вялікай Айчыннай вайны.*

*Зялены колер – гэта сімвал прыроды, веры ў яе жыватворную сілу. Гэта колер жыцця і здароўя, маладосці і адраджэння, працавітасці і стварэння новага.*

*Белы колер азначае духоўную чысціню, бязгрэшнасць, святасць. Гэта колер прымірэння, свабоды, мудрасці і ведаў.*

*Наш сцяг ўпрыгожаны арнаментам з геаметрычных фігур. Гэты ўзор называецца “ўзыходзячае сонцы”.*

*Вялікі ромб азначае засеянае поле, а крыжык унутры яго сімвалізуе сонца. Гэта зварот да вышэйшых сіл прыроды:”Узыдзі, сонейка, сагрэй зямельку нашу, дай нам багаты ўраджай”.*

*Будзе багаты ўраджай – будзе, што есці чым засеяць поле ў наступным годзе! Парныя ромбы абазначаюцьаднаўленнне жыта, а значыць, і працяг жыцця, працяг роду.*

*Можна сказаць, што тры паласы і арнамент на беларускім сцягу нясуць грамадзянам Беларусі і ўсім народам зямлі пажаданне дабра, поспеху і росквіту).*

*(відэаролік)*

**В.** А зараз вазьміце калі ласка кожны свой маленькі сцяг. Прапаную вам незвычайную гульню.

**Лагарытмічная гульня "Дружна ўзялі мы сцяжкі".**

Дружна ўзялі мы сцяжкі.
І на свята ўсе пайшлі.
(*Крочаць у калоне.)*
Уверх сцяжкі мы падымаем,
(*падымаюць сцяжкі ўверх.)*
Уніз ціха апускаем.
(*Апускаюць уніз.)*
Станем дружна ўсе ў кружок -
У каго які сцяжок?
(*Становяцца ў круг.)*
Уверх сцяжкі мы падымаем,
Імі весела махаем.
(*Падымаюць сцяжкі і махаюць ім.)*

**В.** Дзеці, у кожнага сцяга ёсць дрэўка (*паказвае)* і палотнішча (*паказвае.)* Паглядзіце на свае сцягі і пакажыце мне дрэўка (*дзеці знаходзяць.*). А цяпер пакажыце палотнішча (*дзеці знаходзяць.*) Адкажыце, якой формы палотнішча сцяга? (*прамавугольнай*). Колькі на сцягу палосак? (*дзве*). Якога колеру верхняя палоска? (*чырвонага*). Якога колеру ніжняя палоска? (*зяленага*). Якая палоска шырэйшая? (*чырвоная*). Якая палоска вужэйшая? (*зяленая)*

А зараз прапаную пагуляць і праверыць ці ўважліва вы глядзелі і слухалі.

**Электронная дыдактычная гульня "Пытанне-адказ"**

1. Колькі палос на дзяржаўным сцягу Беларусі? (*слайд 3*)
2. Якога колеру няма на сцягу нашай краіны? (*слайд 7*)
3. Што сімвалізуе зялёны колер на сцягу Рэспублікі Беларусь?(*слайд 12*)
4. Абярыце правільны элемент арнаменту са сцяга(*слайд 16*)
5. Як называецця гэты элемент арнаменту? (*слайд 20*)

**В.** Малайчынкі. А зараз я прапаную вам вылажыць на стале з палачак сцяг па схеме (*схема на слайдзе 24*).

*Перад дзецьмі на сталах ляжаць палачкі.*

**В.**Для дрэўка нам патрэбна-3 палачкі, для палотнішча-5.

*Дзеці выкладваюць сцяжкі з палачак.*

**В.** Кожны грамадзянін Рэспублікі паважае сцяг і ганарыцца гэтым сімвалам, ганарыцца сваёй Радзімай. Вы ведаеце, што ў свеце ёсць шмат розных краін. У кожнай краіны свой сцяг. Вам заданне - знайсці сцяг Рэспублікі Беларусь сярод сцягоў іншых краін.

**Электронныя дідактычныя гульні «Пазнай сцяг Беларусі»** *(слайд 25)*
**"Беларусь і краіны-суседзі"** *(слайд 26)*

**В.** Малайцы, дзеці. Вы старанна працавалі і былі уважлівымі. *(слайд 27)*

А скажыце калі ласка, што спадабалася на занятку больш за ўсё? (*Адказы дзяцей).*Што было цяжка?Што лёгка? (*Адказы дзяцей).* Аб чым расскажаце дома бацькам? (*Адказы дзяцей).*Як называецца наша Радзіма?*(Рэспубліка Беларусь).*А гэта значыць, што мы з вамі…? *(Беларусы)*

**В.** Беларусам я завуся! Гэтым ганаруся!

ЛІТАРАТУРА:

1.Ваніна, В.У. Герб, сцяг, гімн. Дзяржаўныя сімвалы Рэспублікі Беларусь / В.У.Ваніна. – Мінск : пачатковая школа, 2016.

2.Вучэбная прагрселбрама дашкольнай адукацыі. – Мінск, Нац. ін-т адукацыі, 2019.